WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 192
(26800)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота БЕЛТА.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ ПРАПРАЦАВАЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ СТВАРЭННЯ Ў МІНСКУ ЦЭНТРА СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ

**Такое даручэнне ён даў учора ў час наведвання Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з работамі, прадстаўленымі на Рэспубліканскай выставе сучаснага выяўленчага мастацтва «Зямля пад белымі крыламі», пагутарыў са скульптарамі і мастакамі, творчай моладдзю. Адна з маладых мастачак у размове з Прэзідэнтам адзначыла, што ў Беларусі нядрэнна было б стварыць цэнтр сучасных мастацтваў, дзе маладыя таленавітыя мастакі, скульптары і прадстаўнікі іншых напрамкаў мастацтва змогуць выстаўляць свае работы. Такія цэнтры ўжо дзейнічаюць у многіх гарадах свету, у тым ліку Вільнюсе, Кіеве, Маскве.

Як адзначыў міністр культуры Павел Латушка, пытанне аб стварэнні цэнтра папярэдне прапрацоўвалася ўжо і абмяркоўвалася з прэм'ер-міністрам, ёсць дамоўленасць і з гарадскімі ўладамі. Ён таксама паведаміў, што Пріорбанк гатовы аказаць фінансавую падтрымку гэтаму праекту. Папярэдне цэнтр плануецца размясціць у будынку парку Чалюскінцаў, які цяпер пустуе. Выслухаўшы прапановы, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Давайце паглядзім».

Кіраўніку дзяржавы паднеслі ў дар работу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — абраз «Спас Нерукатворны» ў тэхніцы мазаіка, памерам 80 на 80 см. Работа выканана творчым калектывам студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў пад кіраўніцтвам Дзяніса Чубукова.

Аляксандра Лукашэнку таксама праінфармавалі аб перспектыўным плане развіцця музея. У будучым вакол яго плануецца стварыць сапраўдны музейны квартал. Паводле слоў міністра культуры, ужо распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя на тры чаргі развіцця музея. Для іх рэалізацыі спатрэбіцца каля Br150 млрд. «У прынцыпе я згодны. Усё гэта трэба распісаць, прадумаць, размеркаваць па гадах нагрузку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Цяпер музей размяшчаецца ў трох будынках: вул. Кірава, 25, вул. Кірава — Леніна, 22, вул. Леніна, 20, з новым корпусам. У двух іншых будынках 1950-х гадоў пабудовы, перададзеных музею ў 1989 і 1999 гадах, размяшчаюцца адміністрацыйныя і тэхнічныя службы музея, а таксама некаторыя фондасховішчы. Рэстаўрацыя і спецыяльныя прыстасаванні гэтых будынкаў не знялі вострую патрэбнасць музея ў дадатковых плошчах.

У 2006 годзе было завершана 15-гадовае будаўніцтва і ўведзены ў эксплуатацыю новы корпус музея. Яго адкрыццё часткова вырашыла праблемы з пашырэннем дэпазітарыя і экспазіцыйных плошчаў. Далейшае пашырэнне магчыма за кошт прылеглых будынкаў каля асноўнага будынка музея. Кіраўніцтва музея таксама лічыць неабходным стварыць на новых плошчах невялікія музейныя сувенірныя магазіны і кафэ. «Сёння ў музея няма нават кафэ, шклянку чаю выпіць няма дзе», — адзначыў у размове з Прэзідэнтам дырэктар музея Уладзімір Пракапцоў.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў старшыні Мінгарвыканкама Мікалаю Ладуцьку знайсці побач з музеем памяшканне, дзе можна было б адкрыць сувенірны магазін за больш кароткія тэрміны, не чакаючы рэалізацыі ўсяго праекта.

Магчымая перадача музею новых будынкаў дасць магчымасць стварыць у перспектыве найбольш поўную экспазіцыю (сёння выстаўлена толькі 5 працэнтаў усёй калекцыі музея). На працягу бліжэйшых 10 гадоў можна будзе паступова стварыць адзіны музейны комплекс, аснашчаны не толькі сучаснай тэхнікай, але і ўнікальнымі экспазіцыямі, у калекцыях якіх будзе дастойна прадстаўлена беларускае нацыянальнае мастацтва.

**Яго Экселенцыі**
**Пану Ху Цзіньтаа**
**Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі**
**Пекін**

Ваша Экселенцыя,

Ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста сардэчна віншую Вас і ўвесь дружалюбны кітайскі народ з нацыянальным святам — Днём абвяшчэння Кітайскай Народнай Рэспублікі.

У Беларусі шчыра захапляюцца поспехамі Вялікага Кітая ў забеспячэнні ўстойлівага эканамічнага прагрэсу, накіраванага на пабудову квітнеючай краіны, дзе пануюць грамадская згода і палітычная стабільнасць.

Пад Вашым мудрым кіраўніцтвам кітайская дзяржава адной з першых перадолела наступствы глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу, што яскрава пацвярджае паспяховае правядзенне ў Шанхаі Сусветнай выставы «ЭКСПА-2010», на якой беларуская і кітайская экспазіцыі з гонарам прадстаўляюць нашы краіны.

Карыстаюся святочнай нагодай, каб пацвердзіць імкненне Рэспублікі Беларусь да далейшага развіцця ўсебаковага палітычнага і гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння з Кітайскай Народнай Рэспублікай, якое набыло сапраўды стратэгічны характар.

Спадзяюся, што падчас нашай сустрэчы ў Пекіне мы падрабязна абмяркуем перспектывы далейшай рэалізацыі сумесных праектаў у крэдытна-інвестыцыйнай, навукова-тэхнічнай, ваенна-тэхнічнай і іншых сферах.

Ад шчырага сэрца зычу Вам, Ваша Экселенцыя, і народу Кітая новых поспехаў у ажыццяўленні абранага курсу і запэўніваю ў маёй самай высокай павазе.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Шостая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю работу **4 кастрычніка 2010 года ў 10 гадзін** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **4 кастрычніка 2010 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует, **что с 1 октября 2010 г. снижаются процентные ставки по ранее заключенным кредитным договорам с физическими лицами в белорусских рублях на финансирование строительства (реконструкции) или приобретения жилых помещений:**

- гражданам, нуждавшимся в улучшении жилищных условий на дату получения кредита, до 17 % годовых с уплатой процентов путем внесения равномерных взносов в период погашения;

- гражданам, не нуждавшимся в улучшении жилищных условий на дату получения кредита, до 21 % годовых с уплатой процентов за фактическое время пользования кредитом.

Подробную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк», на веб-сайте **www.belarusbank.by** и по справочному телефону департамента кредитования населения **8 801 100 44 44.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

ISSN 1990 - 763X

Жывая зямля



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ГОН СЯРОД РАКЕТНЫХ АНГАРАЎ

**МНЕ даўно хацелася расказаць пра лясны куток каля Шарашова — колішні ракетны дывізіён, які цяпер з'яўляецца часткаю Белавежскай пушчы. Гэтае месца вельмі любяць высакародныя алені, і ў час гону іх сюды штосьці па-сапраўднаму вабіць. Нават калі вайсковая частка была тройчы акальцавана калючым дротам, жывёлы прарываліся праз складаны і небяспечны кардон. Цяпер ім тут воля, ніякіх перашкод. І вось фотаздымак, зроблены некалькі дзён таму, падштурхнуў да даўняе задумы. На ім адлюстраваны палёт аленя ў момант уцёкаў са старога ангара, у якім некалі стаяла баявая ракета. Знаходзячыся побач, я пачуў мітуслівае цоканне капытоў па бетоннай падлозе, угледзеўся ў цемру і ў далёкім кутку, за добрых паўсотні крокаў, пазнаў сілуэт аленя. Прыйшлося чакаць, калі малады самец наважыцца пакінуць сваё схованне, і, на шчасце, гэта цягнулася нядоўга. А магло адбыцца і ў прыцемках, і тады зрабіць рэдкі кадр шансаў не было.**

Чаму алень у палёце? На шляху ўцекача былі чорныя рэшткі старога вогнішча, якія палохалі жывёлу. Адзін моцны штуршок — і 4-5 метраў небяспекі алень пераадольвае ў паветры. Але пытанне, чаму ён апынуўся ў пустым памяшканні, застаецца да канца не высветленым. Звычайна жывёлы заходзяць у падобныя пасткі не рызыкуючы. Адна з версій — малады рагуль, верагодней за ўсё, знайшоў тут схованку ад воўчай пагоні. Заднее сцягно і частка жывата ў аленя былі парваныя і крывавілі, што добра відаць на іншых фотаздымках. Адзін з вопытных егераў, пагледзеўшы фотакадры, пацвердзіў: гэта ваўчыны почырк.

— Гэткіх ран ад свайго суперніка-аленя ў час гону жывёла атрымаць не магла, гэта справа толькі воўчых зубоў, — вынес вердыкт егер. — Ракетны ангар выратаваў нашага аленя.

СТАР. 8

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПРЫНЯЎ КАДРАВЫЯ РАШЭННІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 30 верасня разгледзеў шэраг кадравых пытанняў.**

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

ДАМАШКЕВІЧА Мікалая Фёдаравіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Віцебскай вобласці.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

КАСЯЧЭНКІ Рыгора Паўлавіча — першым намеснікам міністра спорту і турызму;

НЕРАДА Сяргея Міхайлавіча — намеснікам міністра спорту і турызму;

КАРМАЗІНА Вадзіма Пятровіча — дырэктарам дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму;

ВАСІЛЬЕВА Ігара Юр'евіча — першым намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама;

КУДРЭВІЧА Ігара Аляксеевіча — кіраўніком адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска;

МАКАРА Ігара Мікалаевіча — старшынёй Горацкага райвыканкама;

КРУПКО Івана Іванавіча — старшынёй Нясвіжскага райвыканкама;

ВАЛЧЭЦКАГА Міхаіла Міхайлавіча — старшынёй Іўеўскага райвыканкама;

СТОЦКАГА Пятра Васільевіча — намеснікам начальніка Беларускай чыгункі;

ЖЫЛІНА Ігара Фёдаравіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гродна Азот»;

БАРАЗНЫ Міхаіла Рыгоравіча — рэктарам установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»;

ДУЛАВАЙ Кацярыны Мікалаеўны — рэктарам установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;

МАСІЕНКІ Юрыя Іванавіча — дырэктарам навукова-даследчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «НДІ сродкаў аўтаматызацыі»;

СІНЯГОЎСКАГА Генадзя Аляксандравіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі завод колавых цягачоў»;

ШЫНКЕВІЧА Яўгена Аляксандравіча — кіраўніком спраў, членам Гродзенскага аблвыканкама;

КУНЦЭВІЧА Уладзіміра Рыгоравіча — членам Гродзенскага аблвыканкама.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ІНІЦЫЯТЫЎНАЯ ГРУПА АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ БУДЗЕ ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ ІНТЭЛІГЕНТНА І ВЕТЛІВА Ў АДНОСІНАХ ДА КАНКУРЭНТАЎ

Ініцыятыўная група па вылучэнні Аляксандра Лукашэнкі кандыдатам у прэзідэнты будзе паводзіць сябе інтэлігентна і ветліва ў адносінах да канкурэнтаў — іншых жадаючых балаціравацца на маючых адбыцца выбарах. Аб гэтым заявіў журналістам кіраўнік ініцыятыўнай групы, старшыня РГА «Белая Русь» Аляксандр Радзькоў. Учора ён прымаў удзел у семінары Мінскай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» са старшынямі раённых арганізацый сталічнай вобласці, перадае БЕЛТА.

«Мы (з удзельнікамі ініцыятыўнай групы. — Заўвага БЕЛТА) дамовіліся працаваць карэктна, нікому перашкаджаць не будзем. Наша канкурэнцыя павінна быць дастойнай, прыгожай», — сказаў Аляксандр Радзькоў. Ён перакананы, што пачатая кампанія па зборы подпісаў для вылучэння кандыдатаў павінна быць праведзена «дакладна, дасведчана, законна». У прыватнасці, ініцыятыўная група, якую ўзначальвае Аляксандр Радзькоў, будзе збіраць подпісы ў строгай адпаведнасці з законам, у дазволеных месцах і ў нерабочы час.

СТАР. 2

## ГРАМАДСКІ САВЕТ МОЖА БЫЦЬ СТВОРАНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

**Удзельнікі чарговага пасяджэння Грамадска-кансультатыўнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі абмеркавалі развіццё сістэмы адукацыі рэспублікі на сучасным этапе, перадае БЕЛТА.**

Яго пасяджэнне прайшло на базе Ліцэя БДУ. Гэта месца было выбрана не выпадкова, бо менавіта гэта ўстанова з'яўляецца адным з лідараў у краіне ў сферы сярэдняй адукацыі. Вучні ліцэя ўжо 138 разоў станавіліся пераможцамі міжнародных алімпіяд. Больш за 60 працэнтаў педагогаў навучальнай установы маюць вышэйшую кваліфікацыю, а некаторыя з'яўляюцца і выкладчыкамі ВНУ.

Перад пачаткам пасяджэння яго ўдзельнікі азнаёміліся з навучальным працэсам у ліцэі і сучаснымі мультымедыйнымі тэхналогіямі, якія пры гэтым выкарыстоўваюцца.

Адкрываючы пасяджэнне, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыня ГКС Уладзімір Макей адзначыў, што адукацыя ў Беларусі абвешчана ў якасці аднаго з прыярытэтаў. Тым не менш, нягледзячы на значныя поспехі ў сферы адукацыі, застаецца і шэраг праблем. «Шмат зроблена, але гэта не значыць, што мы павінны спыняцца на дасягнутым», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

«Хацеў бы паслухаць, што ідзе не так, якія існуюць праблемы, у чым мы адстаём, на вашу думку, ад іншых перадавых краін», — сказаў ён, звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння.

На пасяджэнні члены ГКС абмеркавалі развіццё сістэмы адукацыі ў Беларусі на сучасным этапе, пытанні ўдасканалення сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у рэспубліцы. Былі выказаны розныя прапановы і меркаванні, у тым ліку крытычныя, адносна якасці навучальнага працэсу, статусу выкладчыкаў, навуковай дзейнасці, арганізацыі работы навучальных устаноў і інш.

Як паведаміў першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Жук, цяпер у Беларусі дзейнічаюць амаль 10 тыс. устаноў адукацыі, дзе навучаецца 2 млн дашкольнікаў, навучэнцаў і студэнтаў і працуюць каля 450 тыс. чалавек. Ён нагадаў, што ў Беларусі падрыхтаваны праект Кодэкса аб адукацыі, які прайшоў ужо этап першага чытання ў Палаце прадстаўнікоў. «Фактычна, мы стварылі адукацыйнае права», — адзначыў ён.

Паводле слоў першага намесніка міністра, у 2010 годзе на адукацыю будзе патрачана 4,5 працэнта ВУП, а на наступны год фінансаванне гэтай сферы прадугледжана ў памеры Br11 трлн, або 5,5 працэнта ВУП. Для параўнання ён прывёў даныя, што ў Расіі на гэтыя мэты трацяцца 4,4 працэнта, Германіі — 4,7 працэнта, Іспаніі — 4,8 працэнта, ЗША — 5,6 працэнта ВУП. Цяпер Беларусь па індэксе ўзроўню адукацыі займае 28 месца ў свеце.

Заслухаўшы думкі членаў ГКС, Уладзімір Макей адзначыў, што згодны са многім, што прагучала ў частцы неабходнасці дэбюракратызацыі навучальнага працэсу, зняцця з настаўнікаў некаторай непатрэбнай нагрузкі і інш. Ён падкрэсліў, што ўсе прапановы будуць абагульнены і дэталёва вывучаны.

Удзельнікі пасяджэння таксама ў цэлым падтрымалі ідэю аб неабходнасці стварэння пры Міністэрстве адукацыі Беларусі грамадскага савета, дзе з удзелам экспертаў, якія прадстаўляюць розныя погляды, абмяркоўваліся б найбольш значныя пытанні гэтай сферы.

Акрамя таго, у якасці асобнай тэмы на пасяджэнні ГКС было абмеркавана пытанне аб узаемадзеянні з Форумам грамадзянскай супольнасці ў рамках «Усходняга партнёрства». «Мы зацікаўлены ў тым, каб фармальна наш ГКС меў статус удзельніка гэтага форуму», — сказаў Уладзімір Макей. На пасяджэнні прынята рашэнне накіраваць у адрас кіруючага органа форуму, а таксама еўракамісара па пытаннях пашырэння ЕС і Еўрапейскай палітыкі суседства Штэфана Фюле адпаведныя пісьмы за подпісам членаў ГКС.

Заходзь!

## АДЧЫНЯЕЦЦА «СВЕТ СІМВАЛАЎ»

**Цяпер не трэба бегаць па розных крамах сталіцы ў пошуку тавараў з дзяржаўнай сімволікай: сцягі і рознага тыпу дрэўкі і падстаўкі пад іх, папкі з гербам краіны, сцяжкі з гербамі гарадоў і нават галаграмы — усё гэта цяпер прадаецца ў адным месцы. Па праспекце Незалежнасці, 77 адчыняецца новая крама «Свет сімвалаў». І яшчэ — гэта першая крама ў краіне, у якой выдавецтва «Беларускі дом друку», выстаўляе сваю новую прадукцыю. Сёння буйнейшае ў рэспубліцы паліграфічнае прадпрыемства займаецца не толькі тыражаваннем газет, часопісаў, кніг, выпускам упакоўкі і друкаванай рэкламнай прадукцыі, але і друкам... па тканіне.**

— Мы купілі абсталяванне, аналагаў якому у Мінску няма. Яно дазваляе друкаваць на тканіне шырынёй у 3 метры і 20 сантыметраў (на гэты момант у прадпрыемстваў Беларусі, якія займаюцца друкам па тканіне, максімальная шырыня — 1,5 метра), што дазволіць нам выпускаць сцягі вялікіх памераў, — распавядае **генеральны дырэктар выдавецтва Раман АЛЕЙНІК**. — Сёння многія фірмы выпускаюць сцягі. Але для такой прадукцыі ёсць пэўныя стандарты, што не заўсёды вытрымліваецца. Нашаму прадпрыемству даручылі тыражаванне дзяржаўнай сімволікі, таму што «Дом друку» характарызуе тое, што любая праца ў яго пачынаецца з вывучэння нарматыўнай дакументацыі. Дзяржаўны сцяг мае пэўныя прапорцыі, пэўныя колеры, прычым гэта не проста чырвоны і зялёны, а колер, агавораны ДАСТам, адценні не дапускаюцца, колернасць кантралюецца пэўнымі прыборамі. Акрамя таго, некаторыя фірмы эканомяць на фарбах, у выніку праз некаторы час зялёны колер пераўтвараецца, скажам, у блакітны, чырвоны — у малінавы, і так скажаецца дзяржаўная сімволіка, што недапушчальна. Зараз напрацоўваем вопыт па друку на розных тканінах, спрабуем працаваць у тым ліку і з айчыннымі (так, магілёўскі «Магатэкс» выпускае палімерныя тканіны, прыдатныя для друку). Робім рэпрадукцыі на імітацыі палатна, днямі раздрукавалі малюнкі Шагала...

Дарэчы, у краме «Свет сімвалаў», акрамя прадметаў і сувеніраў з дзяржаўнай сімволікай, можна будзе набываць і іншую друкаваную па тканіне прадукцыю.



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Так, аўтааматарам прапануюцца сцяжкі, якія мацуюцца на машыне, з надпісам «За Беларусь!» альбо «Я люблю Беларусь!». Замежная моладзь не саромецца такім чынам выказваць патрыятызм, а што — наша горшая?

СТАР. 2

## ПАСЛУГІ ІДУЦЬ ДА ВЯСКОЎЦАЎ

**ПАВОДЛЕ звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, цяпер у Беларусі пражывае 637 доўгажыхароў — асобаў ва ўзросце больш за сто гадоў. Пры гэтым 12 чалавек ужо здолелі адзначыць свой 110-гадовы юбілей.**

Агульная для ўсяго свету тэндэнцыя старэння насельніцтва не абышла бокам Беларусь, з 2,5 млн нашых пенсіянераў 1 млн 256,3 тыс. чалавек дасягнулі 65-гадовага, а 956,2 тыс. чалавек — 70-гадовага ўзросту. Адначасова статыстыка адзначае, што становіцца больш пажылых грамадзян, якія фактычна вымушаныя вырашаць свае праблемы самастойна. У прыватнасці, цяпер 155,8 тыс. пенсіянераў лічацца зусім адзінокімі, а 578,7 тысячы пражываюць асобна ад сваіх дзяцей і іншых працаздольных сваякоў. Прычым, заўважыла намеснік міністра Валянціна Каралёва, пры аказанні сацыяльнай падтрымкі асноўная ўвага будзе надавацца менавіта гэтым людзям.

Адным з параўнальна новых напрамкаў у гэтым плане з'яўляецца адкрыццё аддзяленняў кругласутачнага знаходжання для пенсіянераў і інвалідаў, дзе старым і нямоглым людзям прапануецца пажыць пэўны складаны перыяд — скажам, узімку. Другім жа перспектыўным кірункам вызначана пашырэнне пераліку сацыяльных паслуг, і ў тым ліку на платнай аснове. Гаворка ідзе пра такія даволі запатрабаваныя віды дапамогі, як апрацоўка прысядзібных участкаў, рамонт жылля і гаспадарчых пабудоў, нарыхтоўка дроў, замена электраправодкі, рамонт печак. Прычым, адзначыла Валянціна Каралёва, дзякуючы адкрыццю сацыяльных пунктаў такія паслугі становяцца ўсё больш даступнымі для вяскоўцаў. Усяго на сёння ў краіне працуюць 564 сацыяльныя пункты, з якіх 515 — у сельскай мясцовасці, а 433 — у аграгарадках.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.10.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 010,00 | 1 чэшская крона | 166,67 |
| 1 еўра | 4 096,01 | 1 польскі злоты | 1028,43 |
| 1 латвійскі лат | 5 780,12 | 1 расійскі рубель | 98,65 |
| 1 літоўскі літ | 1 187,33 | 1 украінская грыўня | 378,95 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 30,5126 |
| 10 UAH | 38,4386 |
| 1000 BYR | 10,1337 |
| EUR | 41,4392 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

### У Адэскай вобласці мяркуецца наладзіць вытворчасць беларускай сельгастэхнікі

Узаемная зацікаўленасць замацаваная праектам пагаднення паміж Адэскай дзяржадміністрацыяй і Гродзенскім аблвыканкамам.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### 1 КАСТРЫЧНІКА Ў РАСІІ ЗАЧЫНЯЦЬ УСЕ АБМЕННІКІ

**З 1 кастрычніка ў Расіі спыняць працу ўсе вулічныя абменныя пункты валют. Тыя ж аперацыі можна будзе выканаць толькі ў аддзяленнях банкаў ці ў аперацыйных касах.**

Паводле звестак Цэнтрабанка, у Расіі валюту можна купіць-прадаць у 24,5 тысячы падраздзяленняў банкаў — гэта ўдвая больш, чым колькасць абменнікаў на піку іх існавання (11,5 тысячы). Цяпер у Расіі засталося ўсяго 139 абменнікаў.

### У БРУСЕЛІ ПРАФСАЮЗЫ ВЫВЕЛІ НА ВУЛІЦЫ ДЗЯСЯТКІ ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК З 30 КРАІН



**Хваля маніфестацый і страйкаў, якія пракаціліся па Еўропе з пачатку верасня, дасягнула Брусэля. Еўрапейская канфедэрацыя прафсаюзаў паабяцала правесці ў сталіцы ЕС «найбуйнейшую дэманстрацыю пратэсту за апошняе дзесяцігоддзе» і вывесці на вуліцы адначасова больш за 100 тыс. чалавек. Лозунгі гэтых акцый нязменныя паўсюль: «Не скарачэнням дзяржбюджэту, замарожванню зарплат, падразанню сацыяльных выплат». Назіральнікі кажуць, што Еўропа стаіць на парозе сацыяльнага выбуху.**

Характэрна, што ў акцыі ўдзельнічаюць прадстаўнікі прафсаюзаў самых розных ідэалагічных напрамкаў. У натоўпе мільгаюць чырвоныя курткі сацыялістычных прафсаюзаў, зялёныя — эколагаў, блакітныя — лібералаў і аранжавыя — хрысціянскіх дэмакратаў. «Наша мэта — сабраць больш за сто тысяч чалавек», — заявіў генсак Еўрапейскай канфедэрацыі прафсаюзаў Джон Монкс. Апроч бельгійцаў, агульная колькасць якіх склала каля 50 тысяч дэманстрантаў, у маршы пратэсту паўдзельнічалі ад 15 да 20 тысяч французаў, 3 тысячы немцаў, 2 тысячы італьянцаў і яшчэ больш 30 прафсаюзных дэлегацый, якія прыехалі ў Брусель з розных краін Старога Свету.

### КРЫЗІС СЯРЭДНЯГА ЎЗРОСТУ — УЖО Ў 30?



Праца і праблемы ва ўзаемаадносінах з людзьмі прыводзяць да таго, што сёння крызіс пачынаецца не пасля 40 гадоў, а пасля 30. Апытанне брытанскіх экспертаў паказала: вялікая колькасць людзей ва ўзросце 35-44 гадоў пачуваюцца самотнымі ці пакутуюць ад дэпрэсіі. Таксама высветлілася, што занятыя бацькі з гэтай узроставай групы выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі для зносін з дзецьмі. У гэтым усім аўтары даследавання бачаць сапраўдны «крызіс 30 гадоў». З апытаных 21% заявілі, што маюць праблемы ў асабістым жыцці, адчуваюць адзіноту, пакутуюць з-за праблем на працы ці дома. Такая ж колькасць выказала жаданне праводзіць больш часу са сваёй сям'ёй. Усё гэта было перадумовамі для развіцця дэпрэсіі, адзначае ВВС. Як лічаць эксперты, прымаючы да ўвагі сучаснае эканамічнае становішча, справы з псіхалагічным крызісам будуць толькі пагаршацца. Сёння толькі Брытанія траціць 28 мільярдаў фунтаў у год на лячэнне людзей, якія пакутуюць псіхічнымі расстройствамі, выкліканымі напружанай працай. Гэтыя праблемы ўплываюць на становішча ў сям'і. Кожны першы з пяці апытаных казаў пра тое, што страх перад фінансавай нестабільнасцю накладваў свой негатыўны адбітак на сямейныя адносіны. Да таго ж, ад людзей гэтай узроставай групы многага чакаюць, і планка ўвесь час павышаецца, павялічваючы псіхалагічны ціск.

### У БЕРЛІНЕ АДКРЫЛІ ПОМНІК КОЛЮ, ГАРБАЧОВУ І БУШУ

Немцы ўвекавечылі ў бронзе «бацькоў германскага адзінства» — экс-канцлера ФРГ Коля і былых прэзідэнтаў СССР і ЗША Гарбачова і Буша. Іх бюсты ўсталявалі побач з тым месцам, дзе 20 гадоў таму праходзіла Берлінская сцяна.



На думку сучаснікаў, менавіта гэтыя палітыкі ўнеслі самы значны ўнёсак у мірнае ўз'яднанне Германіі. Юбілей гэтай падзеі немцы будуць адзначаць 3 кастрычніка.

Новыя паслугі

# «ГІБРЫДНАЯ ПОШТА» СПРОСЦІЦЬ ЖЫЦЦЁ ОФІСНЫХ КЛЕРКАЎ

**Днямі РУП «Белпошта» прэзентавала сваю новую паслугу — «Гібрыдную пошту». Удзельнікамі прэзентацыі сталі прадстаўнікі РУП «Белтэлекам», работнікі банкаўскіх, страхавых, турыстычных і іншых кампаній і арганізацый.**

«Гібрыдная пошта» ўяўляе сабой комплексную паслугу для карпаратыўных кліентаў па раздрукоўцы, пакетаванню па канвертах і рассылцы інфармацыі, атрыманай ад заказчыка ў электронным выглядзе. Як дзейнічае новая паслуга? Заказчык перадае ва ўчастак «Гібрыднай пошты» электронную базу рассылкі, а паштавікі ў тэрміны, указаныя ў дагаворы, раздрукоўваюць інфармацыю ў электронным выглядзе на папяровых носьбітах і пакуюць яе ў канверты для кожнага кліента асобна, незалежна ад аб'ёму інфармацыйнага блоку. Прадугледжваецца таксама магчымасць дадатковага ўкладання ў канверт (пакет) буклетаў, календароў, прызоў рэкламных розыгрышаў і іншай прадукцыі, прадастаўленай заказчыкам у фізічным выглядзе. Раздрукоўка ажыццяўляецца так, каб найменне і адрас атрымальніка карэспандэнцыі былі бачныя праз адраснае акенца пасля ўкладання матэрыялаў у канверт. Пры рассылцы матэрыялаў на адным лісце дапускаецца фарміраванне селфмейлераў — гэта ліст фармату А4, прызначаны для паштовай адпраўкі, які пры дапамозе канвертавальнага ўстройства складваецца і набывае форму канверта, пасля чаго аўтаматычна заклейваецца. Сфарміраваныя адпраўленні могуць быць простымі, заказнымі або з аб'яўленай каштоўнасцю — у залежнасці ад умоў дагавора на аказанне паслугі.

На « Белпошце» сцвярджаюць, што новая паслуга дазволіць зменшыць выдаткі на апрацоўку зыходзячай карэспандэнцыі і дапаможа павысіць хуткасць яе дастаўкі. Захаванне канфідэнцыяльнасці інфармацыі, перададзенай заказчыкам для рассылкі, «Белпошта» гарантуе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Кватэрнае пытанне

# Калі прычыны важкія...

**Мой муж доўгі час знаходзіўся ў замежнай камандзіроўцы. Не так даўно ён вярнуўся, і мы высветлілі, што яго чэкі «Жыллё» засталіся не перарэгістраванымі. Ці можна гэта зрабіць цяпер?**

**С. П.,** *Кобрынскі р-н.*

Для ўпарадкавання абарачэння і выкарыстання чэкаў «Жыллё» была прадугледжана іх перарэгістрацыя. Дэкрэтам кіраўніка дзяржавы ад 7 чэрвеня 2005 г. № 6 «Аб упарадкаванні абарачэння і выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» былі вызначаны парадак і тэрмін правядзення перарэгістрацыі — да 1 студзеня 2006 г. Пасля Дэкрэтам ад 28 студзеня 2006 г. № 1 гэты тэрмін быў зменены, і ўстаноўлена, што ўсе чэкі, якія знаходзяцца ў грамадзян, падлягаюць перарэгістрацыі ў ААБ «Беларусбанк» да 1 студзеня 2007 г. Пасля 1 студзеня 2007 г. знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё».

Уладальнікі чэкаў, якія не змаглі па важкіх прычынах перарэгістраваць іх у вызначаны тэрмін, могуць скарыстацца нормай, прадугледжанай падпунктам 1.1 Дэкрэта № 6. Калі перарэгістрацыя чэкаў «Жыллё» была немагчымая з-за хваробы іх уладальніка або адсутнасці яго ў Рэспубліцы Беларусь, вызначаны тэрмін перарэгістрацыі працягваецца на час хваробы або адсутнасці.

Асобам, якія не перарэгістравалі чэкі Жыллё, што ім належаць, па іншых важкіх прычынах, гэты тэрмін можа быць працягнуты згодна з рашэннем суда, калі іск аб гэтым прад'яўлены ў суд на працягу агульнага тэрміну іскавай даўнасці.

**Віктар САВІЦКІ.**

# МІЖНАРОДНЫЯ АЎТАПЕРАВОЗЧЫКІ: СКАРАЧАЦЬ ПРАСТОІ!

**Толькі 30—40 % ад усяго часу кіроўца-дальнабойшчык непасрэдна едзе, а 60 працэнтаў займаюць прастоі на пагрузцы і разгрузцы, а таксама прастоі пры праходжанні межаў, адзначыў старшыня асацыяцыі БАМАП Мікалай БАРАВЫ на семінары па павышэнні эфектыўнасці працы міжнароднага аўтамабільнага транспарту.**



Калі і раней пытанні павышэння эфектыўнасці выкарыстання працоўнага часу былі вельмі важнымі для кіраўнікоў арганізацый міжнародных перавозчыкаў, то ў верасні гэтага года яны сталі яшчэ больш актуальнымі. Справа ў тым, што з 20 верасня набылі моц папраўкі да Еўрапейскага пагаднення, што датычыцца працы экіпажаў транспартных сродкаў, якія выконваюць міжнародныя аўтамабільныя перавозкі (ЕСТР). І згодна з гэтымі папраўкамі, новыя рэжымы працы і адпачынку кіроўцаў сталі яшчэ больш жорстка рэгламентаваць час знаходжання кіроўцаў за рулём і час іх абавязковага адпачынку.

— Змены ў гэтых правілах патрабуюць іх укаранення на нашых прадпрыемствах, прытрымлівання прапісаных там рэжымаў. Іх невыкананне будзе карацца штрафамі, якія за мяжой пачынаюцца ад 3 тысяч еўра, — сказаў Мікалай Баравы і дадаў, што для кантролю будзе выкарыстоўвацца лічбавы тахометр. — Навошта такі кантроль патрэбны? Не адкрыю Амерыку, калі скажу, што ў першую чаргу ён патрэбны для вырашэння галоўнай задачы — павышэння ўзроўню бяспекі руху і захавання жыццяў людзей... Наш кіроўца каля 60 % часу прастойвае на пагрузцы-разгрузцы і на межах. І пасля ўсіх гэтых прастояў яму кажуць: «Даганяй час!» І ён, нягледзячы на тое, што прастаяў увесь дзень, пачынае ноччу даганяць згублены час. А зараз лічбавы тахометр запіша, што ў час адпачынку кіроўца працаваў. Не важна, дзе ён парушаў рэжым, але яго спыніць, скажам, іспанскі інспектар і накладзе штраф. Такім чынам, нам не толькі для павышэння эфектыўнасці працы, але і для павышэння бяспекі дарожнага руху трэба шукаць нейкія новыя інструменты, — сказаў старшыня асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў.

Дарэчы, на семінары ўдзельнікі абмяняліся меркаваннямі наконт двух такіх інструментаў — папярэдняга інфармавання і дэкларавання.

Прадстаўнікі прадпрыемстваў, якія займаюцца міжнароднымі перавозкамі і выкарыстоўваюць папярэдняе інфармаванне мытных органаў Беларусі, а таксама карыстаюцца магчымасцямі праекта МСАТ TIR-EPD, падзяліліся сваім досведам у гэтай сферы. Усе адзначылі, што папярэдняя перадача звестак пра груз на мытню значна скарачае час прастояў, што, у сваю чаргу, дазваляе больш эфектыўна працаваць і эканоміць.

— У нас восем аўтацягнікоў, і мы за мінулы год зэканомілі 2400 еўра. Гэта вельмі вялікія грошы, я лічу, а калі браць па часе, то наш аўтапарк зэканоміў 10 гадзін пасіўнага часу — гэта, па сутнасці, адзін рэйс, — падзяліўся вынікамі выкарыстання новых інструментаў **Андрэй КУКУШКІН, намеснік дырэктара ТАА «Экспрэстранс»**.

Што тычыцца ў цэлым працы міжнародных перавозчыкаў у Беларусі, то, па выніках першага паўгоддзя 2010 года, паступленні замежнай валюты ад экспарту паслуг аўтамабільнага транспарту склалі 339 мільёнаў долараў, што на 24,9 % болей за ўзровень 2009 года, паведаміў Мікалай Баравы.

— У тым ліку па грузавым аўтамабільным транспарце гэтая сума склала 304 мільёны долараў, а прырост склаў 27,5 % да ўзроўню 2009 года, — сказаў старшыня асацыяцыі БАМАП. — Выручка ад эксплуатацыі грузавых аўтамабіляў склала 879 мільярдаў рублёў (рост 22,2 % у параўнанні з аналагічным перыядам 2009 года). Трэба сказаць, што нядрэнныя вынікі маем і па аб'ёме перавозак: значны прырост у параўнанні з мінулым годам і практычна дагналі ўзровень дакрызіснага перыяду, а што тычыцца выручкі, то яна нават перавышае на 5% дакрызісны ўзровень.

Разам з тым Мікалай Баравы абазначыў праблему, якая стаяла перад міжнароднымі перавозчыкамі ў 2009 годзе і засталася вострай у 2010-м — гэта абнаўленне парка рухомага саставу. Сёлета міжнародныя перавозчыкі атрымалі толькі 134 адзінкі новай тэхнікі, хаця, напрыклад, за аналагічны перыяд 2008 года гэтая лічба складала каля 800 седлавых цягачоў. Асноўная прычына, якая замінае абнаўленню рухомага саставу — гэта невысокая рэнтабельнасць працы, якая, па словах Мікалая Баравога, складае 1,5 %.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

### ТВОРЫ КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ

А. Рушлевіч (г. Ліда)



**Белыя:** Кре3, Ла5, Лg1, Са1, Се6, Ке8, Kf5, пп. b3, d5 (9).

**Чорныя:** Кре5, Лb2, Лf7, Са3, Са8, пп. b4, e7, g4, h5 (9).

Мат за 3 хады.

У. Сычоў (г. Мінск)



**Белыя:** Кре7, Лс4, Се6, Cf2, пп. b5, c3, d3 (7).

**Чорныя:** Кре5, Ле2, Са2, Сс1, Kg2, пп. b3, c5, c6, g5, h4 (10).

Мат за 3 хады.

Чакаем вашых адказаў.

### ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Прыводзім адказы на кампазіцыі, апублікаваныя 1, 8, 15 і 22 верасня г.г.

У. Кавалёў. 1. Kd2! Кре5+ 2. Kf7+ Кре6 3. Ле5х

1...Крс5+ 2. Kf7+ Кр:c6 3. Ле7х, 2...Cd5 3. Лb5х

1...Кр:c6+ 2. Kf7 C:f7 3. Л:f7х, 2...Крс5 3. Лс7х.

Р. Папоў. 1. Kpd3~2. Kc3x, 1... e4+ 2. Kpd4 e5+ 3. Kpc3 e3 4. Kpd3 e4+ 5. Kpd4 e5+ 6. Kpc3 Ke7, b6 7. Л:b7x, Лd5x, 4...Ce4+ 5. Kp:e4 Kd2+ 6. Л:d2 ed 7. Kc3x.

Д. Мар'янавіч. 1. Кре1! Кре4 2. Фg5 Kpf3 3. Kd2x.

А. Троіцкі. 1. c6 Cg4 2. c7 Kb7 3. c8Ф c:c8 4. Kpb6 Cc8 5. Kpc7+-

А. Хільдэбранд. 1. Лf2 gf 2. b5 e4 3. b6 e3 4. b7 f3 5. b8Л і выйгрыш.

Т. Горгіеў. 1. b7 Ka6 2. Kpc4 Kpc7 3. Kpb5 Kp:b7 4. Kd6+ Kpc7 5. Kde8+ Kpb7 6. Ke6 Kb8 7. Kd6+ Ka8 8. Kc7x.

В. Квяткоўскі. 1. Л:g4! Лf1 2. Лf4 Лg1 3. Лf7x, 1... Лd1 2. Лd4, 1... Лc1 2. Лc4, 1... Лb1 2. Лb4, 1... Лa1 2. Лga4.

В. Барсукоў. 1. Ke4! f3 2. Kf2! Kph7 3. Kpf6 Kpg8 4. Kpe7! Kph7 5. Kpf7 Kph8 6. Kpg6 Kpg8 7. Kg7 Kpf8 8. Kpf6! Kpg8 9. Ke6 Kph7 10. Kpg5! Kpg8 11. Kpg6 Kph8 12. Kpf7 Kph7 13. Kg4! f2 14. Kf8+ Kph8 15. Kf6 f1 Ф 16. Kg6x.

### ПАЗІЦЫЯ ПАЛЕРЫА

Джуліа Палерыа — буйнейшы шахматны тэарэтык канца XVI і пачатку XVII стагоддзя. З яго імем звязваюць заключную пазіцыю, якую вы знойдзеце, разабраўшы наступны эцюд: белыя — Kph5, Kd4, п. a6 (3); чорныя — Kpg3, пп. g2, h3, h4 (4). Выйгрыш. Рашэнне. 1. a7! g1Ф 2. Ke2+ Kpf2 3. K:g1 h2 4. Kh3+ Kpg3 5. Kf2! Kp:f2 6. a8Ф Kpg1 7. Фa1+ Kpg2 8. Фb2+ Kpg1 9. Kph4! h1Ф+ чорныя ўсё ж паставілі ферзя, але пасля 10. Kpg3 узнікае вядомая пазіцыя Палерыа. Нягледзячы на матэрыяльную роўнасць, белыя выйграюць.

## 8 ГАДОЎ ЗА ГЕРАІН

Менавіта такія тэрміны атрымалі два маладыя чалавекі, якія на працягу доўгага часу займаліся распаўсюджваннем наркотыкаў у Светлагорску. Сёлета ў сакавіку пасля рэалізацыі гераіну абодвух зламыснікаў затрымалі супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці. Як паведамілі ў прэс-групе арганізацыі, адзін з іх будзе адбываць пакаранне ў выпраўленчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, другі — ва ўмовах строгага. Рашэнне суда Светлагорскага раёна, які прызнаў расіяніна і беларуса вінаватымі ў незаконным збыце наркатычных сродкаў, уступіла ў законную сілу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## З ПАЧАТКУ ГОДА АДЗІНАЦЦАЦЬ МІНЧАН ПАТАНУЛА Ў ВАННАХ

Часцей за ўсё ў ваннах тонуць пажылыя людзі, якія маюць праблемы са здароўем. Так, з 11 патанулых 9 — пенсіянеры. Прычынамі двух іншых выпадкаў сталі злоўжыванні спіртнымі напіткамі і неасцярожнасць бацькоў, якія пакінулі васьмігадовае дзіця без нагляду.

**Яўген АЛЕЙНІК, «Мінск-Навіны».**




## ПРАВА НА ПРАВЫ

Кажуць, без цыдулкі ты казюрка, а з цыдулкай чалавек.

Яно, магчыма, і так... Але ж ці не кожны можа прыгадаць майстроў экстра-класа, якія, падкрэслім, не маючы спецыяльнай адукацыі, рабілі тое, што спецыялістам і не снілася.

Вось і ў мяне быў такі знаёмец — кіроўца-ас, амаль бог за баранкай. А правоў не меў — лічыў абразай для сябе сядзець на нейкіх курсах, марнаваць свой час і грошы, слухаць выкладчыкаў, якія (па яго меркаванні) не ведалі і не ўмелі і паловы таго, што ён.

Так, без адпаведнага дакумента, чалавек, магчыма, і жыў бы, ды вырашыў памяняць машыну. На цягніку дабраўся да Германіі, прыдбаў там досыць прыстойную «аўдзюху», рушыў у зваротны шлях. І няблізкі ж: немагчыма, здавалася, проста праехаць праз Польшчу, Беларусь і палову Расіі (кіроўца жыве ў Падмаскоўі), а тым больш разлічваць на тое, што цябе ні разу не спыняць паласатым жазлом, не скажуць строгае: «Калі ласка, вашы дакументы». І што тады?

Як высветлілася, наш чалавек заўсёды выйсце знойдзе!

То ў Нямеччыне, дзякаваць Богу, Генадзя не спынілі. Спынілі ў Польшчы, каб пацікавіцца, хто ён і куды. Гена паспрабаваў папулярна патлумачыць, у тым ліку і тое, што правы ў яго забралі ў Германіі за перавышэнне хуткасці, а ўзамен іх выдалі вось гэты квіток.

З ветлівай усмешкай Генадзь паказаў службоўцам... рахунак за вячэру ў берлінскім рэстаране. Аддрукаваны той быў на вельмі добрай паперы, а знаўцаў замежных моў сярод паліцэйскіх не было. Таму, пабачыўшы вязь незразумелых літар, яны пажадалі чалавеку шчаслівай дарогі і ўзялі пад казырок.

Потым Генадзя спынялі яшчэ (і не аднойчы... Хоць правілаў ён не парушаў — прынцыпова): і польскія паліцэйскія, і беларускія ДАІшнікі, і расійскія «ГИБДДэшники». Усім ён паказваў той самы рэстаранны квіток...

Толькі пад самай Масквой трапіўся адзін «занадта разумны» міліцыянер — затрымаў парушальніка, сталі разбірацца. Аднак «зламыснік» ужо і не таіўся, бо прыехаў, лічы, і ўсё расказаў як ёсць.

...Цяпер правы на кіраванне аўтамабілем Генадзь мае. Выпісаць іх распарадзіўся начальнік абласной аўтаінспекцыі, калі даведаўся, што чалавек без ніякіх заўваг і парушэнняў правілаў (а тым больш аварый) праехаў праз чатыры краіны!

Казаў, што, каб мог, яшчэ б і знак спецыяльны выдаў «За работу без аварый».

**Ніна РЫБІК.** *г. Астравец.*

## У СТРАХУ... ВУШЫ ВЯЛІКІЯ

Гэту гісторыю я прывезла з Навагрудчыны ад гаспадыні, у якой другі год запар спыняемся на адпачынак ля Свіцязі.

...То працавалі мы шмат і цяжка, — успаміала наша баба Глаша, — але дастатку не мелі: у гаспадарцы ўсё роўна дзіркі былі! І неяк жа трэба іх латаць!

На чужое, тым больш калгаснае дабро мы рот не разяўлялі. Але ж заставалася яшчэ нічыйнае. І прападала! А гэта ж грэх які...

Дык вось. Параіліся мы са швагеркай і рашылі хоць трохі дабра таго ўратаваць: схадзіць на калгаснае (ужо прыбранае) поле і прынесці адтуль саломы.

Прычакалі, пакуль сцямнее, пабралі посцілкі і ўпотай, крадучыся, пайшлі: я, крыху смялейшая, — наперадзе, швагерка — за мной. А страшна ж абедзвюм, бо, па-першае, красці ідзём. А па-другое, ноч — ну хоць вочы выкалі: пад носам нічога не відаць...

Затое вушы ў нас на семярых: падалося мне, што нешта шамаціць. Я на кукішкі і прысела, шапчу швагерцы: «Сядайма!». А ў той таксама нервы напружаныя — ёй здалося «Цікайма!». Развярнулася яна і куляй назад — да вёскі, да хаты!

Я азірнулася, бачу — толькі пяты яе мільгаюць. Значыць, небяспека нейкая, думаю, і за ёй следам...

Толькі ля гумна, на сваім падворку спыніліся, крыху адсапліся, пытаемся адна ў адной, што гэта было? Нічога?! Як гэта? І ў рогат абедзве.

...Кажуць, што ў страху вочы вялікія. А вушы — ці меншыя?

**Наталля ШВЕДАВА.** *г. Мінск.*

## ВЯРТАННЕ З ЕЎРОПЫ

Усім, відаць, вядомае выслоўе: «Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела»?

Дзень, калі выдавалі стыпендыю, у іх лічыўся за свята. А калі на яго ж у некага выпадаў дзень нараджэння, — не адзначаць было проста грэх...

Вось хлопцы і адзначалі. Як заўсёды. І як заўсёды, лічы, ім не хапіла (не трэба ж пісаць, чаго?). Што рабіць? Крама, як быццам, блізка, але ж патрэбны аддзел з хвіліны на хвіліну зачыніцца.

— Гэта ён для ўсіх зачыніцца, — сказаў адзін з нашых, — а для замежнікаў, мусіць жа, не?!

Ход яго думак хлопцы зразумелі адразу і, хуценька апрануўшыся ў сваё найлепшае, падаліся ў краму.

Зайшлі, хоць суайчыннікаў ужо ніхто не пусціў бы, але, «назваўшыся груздамі, тут жа палезлі ў кош»: «зашпрэхалі» хто як мог. Нехта вучыў англійскую мову, нехта — нямецкую або італьянскую, нават іспанскую, але ж лексічны запас (а тым больш ля прылаўка з віна-гарэлачнай прадукцыяй) быў вельмі сціплы.

— Зо-зо-ля-ля, но пасаран, шнапс трінкен, коніяк, ентшульдзіген зі. Яволь! Шнапс!

Дзяўчына з-за прылаўка паважліва слухала, глядзела на «замежнікаў» і нарэшце далікатна спытала:

— Што вам прапанаваць?

— Водка, русішэ водка, — пачаў адзін.

— Но, но! Лік'ёр...

— Коніак! — паправіў іх трэці і... пальцам паказаў на бутэльку досыць таннага вінаграднага віна.

У крамшчыцы, відаць, не было «інструкцыі», як сябе весці ў падобных выпадках, таму яна, азірнуўшыся па баках, зняла з паліцы абраную пляшку, загарнула яе ў шыкоўную паперу і падала пакупнікам.

Што і казаць: хлопцы былі шчаслівымі. Не столькі ад таго, што набылі спіртное ў забаронены час... Яны — хоць некалькі хвілін — ды пабылі не шараговымі шэрымі грамадзянамі СССР, а як-ніяк еўрапейцамі.

**Мікалай КАМАРОЎСКІ,** *г. Орша.*

## АДВУЧЫЛІ...

Разам з гэтай кабетай мы ехалі ў аўтобусе. Слова за слова — разгаварыліся, сваё дзявоцтва ды замужжа сталі ўспамінаць.

Якраз тады, як расказала кабета, у яе цікавая прыгода была. Бо яна працавала, як большасць народу, — днём, а мужык яе — па начах. Раніцай дома ўбачацца і, лічы, размінуцца, бо ёй жа сыходзіць трэба...

А ён, можа, дужа кахаў яе, можа баяўся, каб не пакрыўдзіў хто, можа раўнаваў... Таму гадзінку-другую дома пабудзе, пасп іць — і на працу да яе: да канторы падыдзе і стаіць — на вокны пазірае або ходзіць туды-сюды...

Яна спачатку выбягала да яго — на крыху, паразмаўляць, потым — папрасіць, каб дадому ішоў, бо бабы смяюцца...

Ён, бывала, слухаўся, сыходзіў. А назаўтра пад тымі вокнамі зноў дзяжурыў, і невядома, колькі б гэта цягнулася, каб адна з тых баб-перасмешніц раптам не сказала: «Хочаш, адвучу твайго чалавека пад вокнамі стаяць?».

Тая вельмі хацела...

А далей — і смех, і грэх: вясна была, чалавек яе ў куртцы хадзіў. Рукі звычайна трымаў у кішэнях — вялікіх такіх, накладных. Вось яны і адтапырыліся. Дык тая перасмешніца злавіла недзе вялікую зялёную жабу і, прабягаючы міма, кінула яму ў кішэнь.

А мужык жа на вокны глядзеў — нічога апроч не бачыў: як стаяў, так і стаіць сабе. А потым, мусіць, рукі змерзлі. Ён іх пагрэць, а ў кішэні... Штосьці халоднае... І... жывое.

Перасмыкнуўся бедны, стаў расшпіляцца — куртку з плячэй і вобзем...

Цырк гэты з рогатам уся кантора глядзела!

Больш пад яе вокны той мужык не прыходзіў — адвучылі.

**Т. АЛЯХНОВІЧ,** *г. Слуцк.*

## З ЦІСКАМ НЕ ЖАРТУЮЦЬ

Ёсць такі «гатунак» мужчын: іх хлебам не кармі, — дай нешта «змарозіць» альбо збрахаць.

У знаёмым сяле калгасны аграном такі быў — Арыстархавіч. На ўсіх сходах ён на галёрцы ўсаджваўся, сярод маладых спецыялістак, і ўжо тады...

Ну, напрыклад. Сядзіць ён раз на любімым месцы і знакі дзяўчатам робіць: маўляў, глядзіце, што вам пакажу. Яны галовы ўніз. Ён падцягвае ўверх калашыну над баціанкам, а там кальсоны — мультановыя, у вялікія чырвоныя кветкі, на матузкі завязаныя. «Во, — шэпча, —жонка са свайго халата пашыла. Наўё...». Дзеўкі, вядома ж, у рогат, у покат. Але заўвагу з прэзідыума не ім робяць, — Арыстархавічу.

Ён у адказ (і з самым нявінным тварам): «А што я? Прычым тут я?.. Дзеўкі... Ім палец пакажы...».

Ці вось яшчэ. «Асядлаў» раз аграном свайго «козліка», паехаў палі аглядаць. Па дарозе назад даганяе жанчын, што з працы ідуць, прыпыняецца, каб падвезці. І не проста так — маўляў, садзіся, хто хоча. А сам, выскоквае з машыны, галантна адчыняе дзверцы, яшчэ і падсаджвае кожную... Кавалер!..

А яны ж вазьмі ды і заўваж, што ў яго, вось такога, кашуля брудная — у крыві. «Вой, — здзіўляюцца, — а што ж гэта такое?».

Арыстархавіч тут жа прымае адпаведны выгляд і кажа: «Ды ніякага жыцця з гэтай працай! Пераджываю ж... За кожнае зярнятка! Ды і перагрэўся, мусіць... Ціск, жанчынкі, падняўся — з носа кроў пайшла: абкапаўся».

Бабы тут жа давай яго шкадаваць: «Ты ж хаця глядзі, Арыстархавіч, з ціскам дурныя жарты! Прыедзеш дамоў, — чайку гарачага папі і лажыся. Адразу ж! Таблеткі яшчэ прымі».

Хворы пры гэтых словах яшчэ больш зніціўся: «Ага, — кажа, — у маёй жонкі паляжыш... Яна мёртвага з труны падыме і сем работ загадае. А я ж жывы яшчэ...».

Бабы давай абурацца ды той жонцы костачкі мыць..

За гэтым заняткам і да хаты іхняй пад'ехалі. Гаспадыня, бачаць, на вуліцы стаіць — надчэквае. Жанчыны да яе: «Што ты сабе думаеш, баба?! Зусім здурнела са сваімі работамі?! Чалавеку во дрэнна было. Яму паляжаць цяпер трэба!».

Той няўцям: «А з чаго гэта — «яму і паляжаць?».

«Ну дык ціск жа высокі! Бачыш як абкапаўся — з носа кроў ішла».

Жонка ў рогат: «Ага... Ішла... Вы яго болей слухайце — ён вам і не тое яшчэ раскажа... Ціск у яго? Які, бабачкі?! Гэта ж ледзь упрасіла, каб раніцай пеўня засек! Вось кроў і пырснула... Казала ж яму, памяняй кашулю! Не — у бруднай так і папёрся!».

...Што цікава, жартаваў Арыстархавіч пераважна з кабетамі, з мужчынамі — толькі зрэдку, бо не ўсё яны могуць зразумець.

**Соф'я КУСЯНКОВА,** *в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**


## ИНФОРМАЦИОННОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ИВАЦЕВИЧСКИМ РАЙОННЫМ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫМ КОМИТЕТОМ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Характеристика земельных участков, выставляемых на аукцион

| Местонахождение (адрес земельного участка) | Брестская область, Ивацевичский район, автодорога М1/Е30 Брест–Минск–граница РФ, 177 км (право), (далее – лот № 1) | Брестская область, Ивацевичский район, г.п. Телеханы, ул. Пушкина, 8 (далее – лот № 2) | Брестская область, Ивацевичский район, д. Милейки, ул. Садовая, 12А (далее – лот № 3) |
|---|---|---|---|
| Площадь участка, га | 0,2688 | 0,0210 | 0,0100 |
| Виды земель | покрытые лесом | общего пользования | неиспользуемые |
| Вещное право на земельный участок | аренда сроком на 99 лет | аренда сроком на 10 лет | аренда сроком на 10 лет |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства объекта придорожного сервиса (кафе на 30-50 мест, туалеты, душевые кабины) | для установки и обслуживания временного торгового павильона | для установки и обслуживания торгового павильона |
| Кадастровый номер участка | 123400000001000750 | 123455500001001336 | 123485806101000178 |
| Начальная (стартовая) цена земельного участка, рублей | 653560 (шестьсот пятьдесят три тысячи пятьсот шестьдесят) | 615710 (шестьсот пятнадцать тысяч семьсот десять) | 4580 (четыре тысячи пятьсот восемьдесят) |
| Наличие строений, сооружений на участке | нет | нет | нет |
| Наличие инженерных коммуникаций на прилегающей территории | нет | линия электропередачи, водопровод, связь | линия электропередачи, водопровод, канализация, газопровод, связь |
| Состояние дорожной сети улиц | с усовершенствованным покрытием | с усовершенствованным покрытием | с усовершенствованным покрытием |

Аукцион состоится **5 ноября 2010 года** в 14 час. 30 мин. в малом зале райисполкома по адресу: Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, д. 44, каб. 116.

Для участия в аукционе индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляет комиссии следующие документы:

заявление об участии в аукционе;

копию платежного поручения, заверенную банком, о внесении суммы залога в размере: лот № 1 – **65360** (шестьдесят пять тысяч триста шестьдесят) рублей, лот № 2 – **61570** (шестьдесят одна тысяча пятьсот семьдесят), лот № 3 – **460** (четыреста шестьдесят) рублей на р/с № 3641000000032 в филиале № 111 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Ивацевичи, код банка 623, получатель платежа – Ивацевичский райисполком, УНП 200100489, назначение платежа 04002;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц, индивидуальные предприниматели предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Аукцион проводится при условии наличия не менее двух участников аукциона по каждому лоту.

Передача земельных участков в аренду производится без изменения их целевого назначения с условиями:

внесения победителями аукциона платы за право заключения договоров аренды;

возмещения победителями аукциона исполкому расходов по организации и проведению аукциона в размере: **1270915** рублей по лоту № 1, **1599170** рублей по лоту № 2, **2027096** рублей по лоту № 3;

заключения победителями аукциона с Ивацевичским райисполкомом договоров аренды земельных участков и осуществления в двухмесячный срок со дня получения решения исполкома о предоставлении земельных участков в аренду государственной регистрации прав на земельные участки;

получения победителями аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки, утверждения проектной документации на строительство объектов в срок, не превышающий 2 года для лота № 1 и 6 месяцев для лотов № 2, 3 со дня принятия исполкомом решения о предоставлении земельных участков;

осуществления начала строительства объектов после получения разрешений на строительство не позднее 6 месяцев после разработки и утверждения в установленном порядке проектной документации на объекты;

с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализацией древесины государственным лесохозяйственным учреждением «Барановичский лесхоз» по лоту № 1;

осуществления строительства объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Договор аренды земельного участка по результатам аукциона подписывается сторонами после принятия исполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка и не позднее 2 рабочих дней после оплаты победителем аукциона стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона. Указанную плату победители аукциона обязаны внести в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполкомом решения о предоставлении земельных участков.

Предварительное ознакомление с земельными участками на местности проводится при подаче заявления.

Заявления на участие в аукционе принимаются **с 5 октября 2010 г.** по адресу: 225291, Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, 44, каб. 422 с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 1 ноября 2010 года включительно.

Контактные телефоны в г. Ивацевичи: (801645) 2 13 69, 2 54 76, 3 00 94.

**Государственное удостоверение** на право охоты и карточку учета нарушений к нему на имя **Горбачёва Александра Дмитриевича считать недействительными** в связи с утерей.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### строительства панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутской – Хабаровской

**Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутская – Хабаровская, опубликованной в газете «Звязда» 23 сентября 2010 г. (№ 186 (26794)).**

**Информация о Застройщике**

**Частное строительное унитарное предприятие «Витасанплюс» (Частное предприятие «Витасанплюс»).**

**Место нахождения:** г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, помещение 9.

**Режим работы:** понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация Застройщика:** Частное предприятие «Витасанплюс» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 24 января 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, Частное предприятие «Витасанплюс» участие не принимало.

**Информация о проекте**

**Цель проекта:** строительство панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутская – Хабаровская.

**Срок реализации проекта:** 3 квартал 2010 г. – 4 квартал 2011 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 460–15/10, выданное 15.06.2010 г. Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома:** г. Минск, район пересечения улиц Иркутская – Хабаровская.

**Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома:** 19-этажный крупнопанельный односекционный жилой дом из конструкций серии М 111-90 ОАО «МАПИД». Количество квартир в доме – 132, в том числе: однокомнатных – 57 ед., двухкомнатных – 57 ед., трехкомнатных – 18 ед. Отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется. Наружная отделка – покрытие бетонных панелей защитно-полимерным составом ЗДПС, покраска акриловыми фасадными красками по грунтовке. Высота этажа – 2,8 м. В каждой квартире есть летние помещения – остекленные лоджии. В квартирах первого этажа запроектированы погреба под лоджиями, используемые в хозяйственных целях. В доме предусмотрен мусоропровод и два лифта грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Сети водопровода запроектированы из полиэтиленовых напорных труб, бытовой канализации – из канализационных поливинилхлоридных труб. Проектом предусматривается прокладка волоконно-оптического кабеля (ВОЛС) от оптического узла, расположенного по ул. Байкальской, 37 до жилого дома и установка приемника прямого канала «ГАММА – 11» и передатчика обратного канала. Въезд на территорию жилого дома принят с переулка Томского.

**Цены на объекты долевого строительства (второй этап продаж):**

однокомнатные квартиры – **3 020 000 рублей** за 1 кв.м общей площади;

двухкомнатные квартиры – **2 870 000 рублей** за 1 кв.м общей площади;

трехкомнатные квартиры – **2 720 000 рублей** за 1 кв.м общей площади;

**Условия оплаты:** единовременная выплата всей стоимости строящейся квартиры не позднее 3 (трех) календарных дней с момента подписания дольщиком договора создания объекта долевого строительства. Исключительно по соглашению сторон, дольщику, в индивидуальном порядке, может быть предоставлена рассрочка платежей и скидка от общей стоимости квартиры.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства** – 30 единиц.

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 02 сентября 2010 г. № 1997 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение горисполкома».

Свидетельство (удостоверение) № 500/727 – 4427 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000002007417, расположенного по адресу: г. Минск, район пересечения улиц Иркутской – Хабаровской, площадь – 0,3848 га, назначение – земельный участок для строительства панельного многоэтажного жилого дома, составленного Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 21 сентября 2010 г.

Свидетельство (удостоверение) № 500/727 – 4426 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000002007416, расположенного по адресу: г. Минск, район пересечения улиц Иркутской – Хабаровской, площадь – 0,0588 га, назначение – земельный участок для строительства повысительной насосной станции № 2 (по генплану), составленного Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 21 сентября 2010 г.

**Границы земельного участка:** улица Иркутская – улица Хабаровская – переулок Томский.

**Площадь земельного участка:** земельный участок для строительства панельного многоэтажного жилого дома – 0,3848 га, земельный участок для строительства повысительной насосной станции № 2 (по генплану) – 0,0588 га.

**Элементы благоустройства:** вся территория участка застройки благоустраивается и озеленяется. Пешеходные дорожки и тротуары выполняются из мелкоразмерной тротуарной бетонной плитки.

**Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме:** на первом этаже запроектированы помещение товарищества собственников и электрощитовая. Ниже отметки 0,000 м предусмотрены помещения ИТП, водомерной, пожарной насосной.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома, поступают в общую собственность дольщиков.

**Предполагаемый срок ввода многоквартирного жилого дома в эксплуатацию:** 4 квартал 2011 года.

**Договор генерального подряда:** договор генподряда на строительство № 30/09-10 от 30.09.2010 г. заключен с Открытым акционерным обществом «МАПИД».

**Договор строительного подряда:** договор строительного подряда № 2/08 от 16.08.2010 г. заключен Застройщиком с Обществом с дополнительной ответственностью «Савладстрой».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя Застройщика – ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел. 8 017 2 900 901, 8 029 1 907 901) или на сайте www.vivainvest.by.

# ГОН СЯРОД РАКЕТНЫХ АНГАРАЎ









(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Амаль кожную восень, з дазволу кіраўніцтва Белавежскай пушчы, наведваю шарашоўскі вальер, каб зрабіць фотаздымкі аленяў у час гону. Калі нескладана перахітрыць стомленага аленя-самца, вылічыць ягонае знаходжанне па гучным рове, падкрасціся на адлегласць у дваццаць-трыццаць метраў. У гэты час жывёлы «заклапочаныя» і не надта асцярожныя. Яшчэ прасцей чакаць іх на паляўнічай вышцы каля кармавой пляцоўкі. Але тады трэба мець моцнае цярпенне, каб выседзець 5-6 гадзін запар. У вальеры ўзведзены з добры дзясятак моцных вышак-хатак. Жывёлы любяць каля іх трымацца, бо заўсёды знойдуць тут чым падсілкавацца. Алені і дзікі даўно вызначылі для сябе самыя «смачныя» пляцоўкі. Жывуць у вальеры і лось, і казуля, якіх прывабіць ласункамі немагчыма. Водзіцца барсук. Вальер быў створаны ў 1998 годзе і доўгі час з'яўляўся самым вялікім у Еўропе — тры тысячы гектараў (цяпер самы вялікі — 5 тысяч гектараў — вальер у Прыпяцкім нацыянальным парку).

Амаль усе віды распаўсюджаных беларускіх біятопаў спрыяюць захаванню папуляцыі жывёл: хваёвыя, яловыя, сфагнавыя і змяшаныя лясы, верхавыя балоты, пясчаныя пагоркі, лясныя рэчкі. Няма толькі возера. Яго ў нечым замяняюць бабровыя запруды. Тэрыторыя вальера абнесена сеткавай агароджай з дроту даўжынёю амаль у 38 кіламетраў. Самым цікавым і дагэтуль загадкавым месцам вальера застаецца былы ракетны дывізіён, ад якога акрамя васьмі ракетных ангараў і трох паўразбураных бетонных укрыццяў нічога не засталося. Да цаглінкі разабраны салдацкія казармы, афіцэрскія дамы, гаспадарчыя пабудовы. Нібы тыя краты, жыхары навакольных вёсак у пошуках дарагой медзі выкапалі з паўтараметровай глыбіні ўвесь кабель. За час сыходу ракетчыкаў на тэрыторыі дывізіёна вырас сапраўдны хвойнік, сярод якога толькі бетонныя дарогі-палосы і пляцоўкі перад агромністымі ангарамі, у якіх, па словах шарашоўцаў, стаялі ракеты «СС-20» з баявымі галоўкамі. Дывізіён з'яўляўся першай лініяй абароны на заходніх рубяжах колішняй звышдзяржавы. Патрапіць на ягоную тэрыторыю было немагчыма — далёка на подступах ляжалі замаскіраваныя загароджы з блытанага дроту, некалькі радоў нацягнутай «калючкі» з высокай напругай. Бывалі выпадкі гібелі людзей на гэтых агароджах, не кажучы ўжо пра жывёл. Дрот і дагэтуль сустракаецца сярод чарнічніку, урос у хваёвыя камлі. Калі пачынаўся гон, алені імкнуліся да дывізіёна, як замбіраваныя. Чаму? Напэўна, іх вяла сюды генетычная памяць, тут спрадвеку адбываліся аленевыя паядынкі за валоданне гарэмамі. Цяпер у старых, парослых лесам ракетных ангарах — кармавая база для вальерных жывёл: буракі, сена, збожжа. Алень і дзік любяць схавацца на гэтых ангарах, успрымаюць іх за натуральныя пагоркі. Амаль штодня егер Генадзь Гроцкі (на фотаздымку) загружае ў невялікі трактар корм і вязе яго ад пляцоўкі да пляцоўкі. Часам дзікі, пачуўшы гук, бягуць навыперадкі за трактарам. Егер ведае ўлюбёныя месцы дзённага адпачынку аленя, так званыя купалкі, і любіць паназіраць за вольналюбівымі асцярожнымі жывёламі. На кожнай вышцы ім вядзецца журнал уліку жывёл. Але беспадстаўна турбаваць іх нельга, таму ўваход і знаходжанне пабочных людзей у вальеры без спецыяльнага дазволу забаронена. Амаль як у часы, калі дывізіён дзейнічаў.



Мне вельмі падабаецца ўрочышча за дывізіёнам — Поцераб, дзе ў час гону адбываюцца частыя начныя двубоі паміж самцамі. Пасля іх няцяжка знайсці ў траве зламаны рог ці камякі поўсці. Сёлета я патрапіў толькі на завяршэнне гону: лес быў маўклівы, і зрабіць цікавых фотаздымкаў не ўдалося. Да таго ж цяпер побач з вальерам будуецца аб'язная дарога вакол Белавежскай пушчы, і з-за позніх будаўнічых работ аленевыя бойкі, як раней, назіраць не давялося. Прыйдзецца чакаць гэтых імгненняў яшчэ адзін год. А магчыма, і болей.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.11 | 18.46 | 11.35 |
| Віцебск — | 7.01 | 18.35 | 11.34 |
| Магілёў — | 7.01 | 18.36 | 11.35 |
| Гомель — | 6.57 | 18.34 | 11.37 |
| Гродна — | 7.26 | 19.02 | 11.36 |
| Брэст — | 7.26 | 19.03 | 11.37 |

**Месяц**
***Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**
***Пр.*** *Арыядны, Ірыны, Соф'і, Барыса, Веньяміна, Івана, Іларыёна, Міхаіла, Уладзіміра.*
***К.*** *Дануты, Тэрэзы, Ігара, Марка.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты

### 1 кастрычніка

**Сёння — Міжнародны дзень музыкі.**

**1897 год** — праведзены першы і адзіны ў XIX стагоддзі поўны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі. Колькасць жыхароў Расіі (без уліку Фінляндыі) складала 126,4 млн. чалавек, з іх 13 працэнтаў — гарадское насельніцтва. У Беларусі (у сучасных межах) пражывала 6 млн 300 тысяч чалавек.



**1946 год** — у Нюрнбергу Міжнародны ваенны трыбунал завяршыў судовы працэс па справе галоўных нацысцкіх ваенных злачынцаў (адкрыўся 20 лістапада 1945 г.). Міжнародны ваенны трыбунал быў створаны Лонданскім пагадненнем паміж СССР, ЗША, Францыяй і Вялікабрытаніяй, да якога далучыліся яшчэ 19 дзяржаў. Галоўным абвінаваўцам ад СССР выступаў Раман Рудэнка. Пад суд былі аддадзены 24 ваенныя кіраўнікі фашысцкай Германіі. Падчас працэсу адбыліся 403 пасяджэнні, заслуханы сведчанні падсудных, 116-ці сведак, разгледжана больш за 5 тысяч дакументальных доказаў, у тым ліку пра злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі.

## Цытата дня:

***«Сапраўды, бываюць цяжкія хвіліны, але супраціўляйся ім — павярніся да дрэннага спінай, і ты пераадолееш цяжкасці. Нават старасць і тая, калі захоча, не прагнецца пад халодным покрывам ночы».***

**Ціт Лукрэцый (I ст. да н.э), рымскі паэт і філосаф.**

---

*А не шкодзь!*

# СУД ЗРАБІЎ ПАБЛАЖКУ. ЦІ ПОЙДЗЕ ЎРОК НА КАРЫСЦЬ?

**За незаконную здабычу рыбы забароненымі прыладамі лоўлі суд Асіповіцкага раёна прызначыў непрацуючаму браканьеру 1978 года нараджэння пакаранне ў выглядзе папраўчых работ тэрмінам на 1 год 6 месяцаў з утрыманнем 15 працэнтаў заробку ў даход дзяржавы. Прысуд вынесены за правапарушэнне, здзейсненае на працягу года пасля адміністрацыйнага спагнання. Відавочна, правільных высноў тады парушальнік не зрабіў.**

А вось двум іншым браканьерам, можна сказаць, пашчасціла. Суд Капыльскага раёна палічыў магчымым вытворчасць па крымінальнай справе спыніць, вызваліць іх ад крымінальнай адказнасці (злачынства яны здзейснілі ўпершыню, нанесеную шкоду пакрылі добраахвотна да суда, становяча характарызуюцца па месцы жыхарства і вучобы). Праўда, за незаконную здабычу рыбы забароненай прыладай, у перыяд забароны на яе лоўлю і нанясенне шкоды прыродзе ў буйным памеры ім давялося адказаць матэрыяльна — у выглядзе штрафу ў памеры 700 тысяч рублёў кожнаму. Галоўнае, каб гэты ўрок пайшоў на карысць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд + лабірынт (28 верасня). Па гарызанталі:** Бархан. Хмара. Шынка. Гай. Анод. Німб. Эфір. Урал. Луза. Кнот. Камінак. Суша. Залп. Рымар. Метал. Анап. Арама. Маніла. Горац. Ежа. Сахара. **Па вертыкалі:** Дранік. Крама. Мана. Бут. Сані. «Шурале». Нашчадак. Паж. Лаза. Аазіс. Маг. Дэлі. Зеро. Ачаг. Фундатар. Авіза. Лама. Алей. Рак. Плацкарта. **У лабірынце:** 1. Гарлачык. 2. Майстэрства. 3. Пагарда. 4. Сіваграк. 5. Прыклад. 6. Настурка. 7. Крыжадзюб. 8. Дзераза. 9. Выпадак. 10. Сырадой. 11. Прызба. 12. Стваральнік. 13. Старшыня. 14. Бэз. 15. Клямка. 16. Падмурак.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




---

*Хочаце — верце...*

# СІНЯВОКІЯ МУЖЧЫНЫ НЕБЯСПЕЧНЫЯ, ЯК СЫПУЧЫЯ ПЯСКІ, а шэравокія — тое, што трэба!



**Ён можа ўскалыхнуць душу пяшчотнымі словамі, зачараваць манерамі сапраўднага джэнтльмена, закружыць галаву праявамі рыцарскай адданасці... і падмануць вашы жаночыя чаканні. Толькі яго вочы ніколі не схлусяць. Дакладней — іх колер.**

**Светла-карыя вочы,** як правіла, належаць мужчыне прыемнаму з усіх бакоў. Ён уважлівы, чароўны, жартаўлівы, ненастойлівы. Ён — вельмі лёгкая ахвяра Амура, аднак хутка губляе цікавасць да аб'екта кахання. Схільны прыслухоўвацца да сваіх капрызаў. Калі да яго крыху падлашчыцца, то такога мужчыну можна браць голымі рукамі. Праўда, ненадоўга.

**Цёмна-карыя вочы** — бясспрэчнае сведчанне тэмпераменту і гіпертрафіраванага пачуцця ўласнасці. Уладальнікі цёмна-карых вачэй імкнуцца заваёўваць, караць і ўладарыць. Калі дабіваюцца свайго, гатовыя абараняць гэта бескампрамісна. З імі не вельмі проста, затое надзейна.

Мужчыны з **карымі вачамі** «раскрываюцца» пасля 35-і. А да гэтага ўзросту яны шукаюць, эксперыментуюць, сумняваюцца і пачынаюць усё наноў. У сталым узросце яны здольныя на глыбокія пачуцці, але, на жаль, неабавязкова да адной жанчыны.

**Блакітнавокія** — наадварот, «гарацЬ» да 40 гадоў, а пасля аддаюць перавагу тэлевізару ці якімсьці гульням. Аднак нават у перыяд росквіту з імі трэба абыходзіцца вельмі асцярожна: хваліць, захапляцца іх розумам, прыгажосцю, адзеннем. Тады яны будуць задаволеныя сабой, а вы — імі...

Мужчыны з **шэрым колерам вачэй** — якраз тое, што трэба! Гэта рашучыя, ініцыятыўныя, моцныя істоты. За імі — як за каменнай сцяной, пакуль вы ім цікавыя. Калі ж не — яны проста пойдуць далей. А вось пасля 50 гадоў такія мужчыны прагнуць надзейнага жаночага пляча.

**Сінявокія** мужчыны небяспечныя, як сыпучыя пяскі. Яны здаюцца рамантычнымі, добрымі і наіўнымі. Але гэта — падман! Сінявокія бяруць усё, што ім падабаецца, і без шкадавання развітваюцца з тым, што ўжо надакучыла. Самае дзіўнае, што жанчыны на іх за гэта не крыўдуюць...

Мужчыны з **зялёнымі вачамі** асабліва прыгожыя ў маладосці. Лёгка загараюцца, дзеля жанчыны здольныя на подзвігі і вар'яцтвы, з-за чаго часта спатыкаюцца. У сталым узросце становяцца больш разважлівымі, сур'ёзнымі і нават асцярожнымі. Тут ім і патрэбна свая жанчына — адданая, стойкая, звыклая сяброўка.

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**

---

*Спорт-тайм*

## У ВАСЬМЁРЦЫ ЛЕПШЫХ




Беларускія баскетбалісткі ў заключным матчы кваліфікацыйнага раўнда чэмпіяната свету ледзь-ледзь адолелі грачанак — 74:70. Сёння, 1 кастрычніка, яны згуляюць з нядаўнімі суперніцамі па таварыскіх матчах — зборнай Расіі (пачатак у 14.15 па беларускім часе). Тры іншыя чвэрцьфінальныя пары атрымаліся такімі: ЗША — Паўднёвая Карэя, Францыя — Іспанія, Аўстралія — Чэхія.

## У «ДЫНАМА» ТРАШЧЫЦЬ АБАРОНА

Мінскае «Дынама» прайграла 29 верасня ў Ханты-Мансійску мясцовай «Югры» — 4:7. У сталічных хакеістаў ужо ў другім матчы назіраюцца вялікія праблемы ў абароне сваіх варот. «Югра» з'яўляецца дэбютантам КХЛ.

## АЗАРАНКА РАЗМІНАЕЦЦА

Беларуска Вікторыя Азаранка выйшла ў паўфінал турніру ў Токіа з прызавым фондам 2 млн доляраў. Учора ў 1/4 фіналу (чацвёрты круг) з лікам 6:2, 6:1 яна перамагла амерыканку Кока Вандэвеге. Наступнай суперніцай Вікі будзе пераможца чвэрцьфінальнай пары Караліна Вазняцкі — Агнэшка Радваньска.

## «БАРСЕЛОНА» ЗНОЎ НЕ ПЕРАМАГЛА «РУБІН»

У еўрапейскай Лізе чэмпіёнаў адбыліся матчы другога туру. Мацнейшыя каманды Еўропы атрымалі чарговыя перамогі над менш тытулаванымі супернікамі, і толькі чэмпіён Іспаніі не змог абгуляць на выездзе былога чэмпіёна Расіі.

Група А: «Тотэнхэм» — «Твентэ» — 4:1, «Інтэр» — «Вердар» — 4:0; група В: «Хапаэль» — «Ліён» — 1:3, «Шальке» — «Бенфіка» — 2:0; група С: «Валенсія» — «Манчэстэр Юнайтэд» — 0:1, «Глазга Рэйнджэрс» — «Бурсаспор» — 1:0; група D: «Панацінаікас» — «Капенгаген» — 0:2, «Рубін» — «Барселона» — 1:1; група Е: «Рома» — «Клуж» — 2:1; «Базель» — «Баварыя» — 1:2; група F: «Спартак» — «Жыліна» — 3:0, «Чэлсі» — «Марсэль» — 2:0; група G: «Аякс» — «Мілан» — 1:1; «Асэр» — «Рэал» — 0:1; група Н: «Брага» — «Шахцёр» — 0:3, «Партызан» — «Арсенал» — 1:3.

# АСІНА

**Асіна — прыгожае, стройнае ліставое дрэва, якое ў народнай культуры стала сімвалам страха, палахлівасці і няўпэўненасці — яго закругленае лісце дрыжыць пры кожным павеве ветру. Лічыцца, што асіна «крадзе» (паглынае, забірае да сябе) энергію чалавека. У казках Дабрыня павесіў Змея Гарыныча менавіта на асіну — каб той не вярнуўся да жыцця.**

- Завостраны асінавы кол — «Перунова паліца» — быў моцным сродкам барацьбы з ведзьмакамі, калдунамі і вурдалакамі. З асіны рабілі барану, якой абганялі вёску ў час барацьбы з эпідэміямі.
- У хрысціянскай культуры асіна атрымала назву «Іудава дрэва», таму што Іуда павесіўся менавіта на ёй. З таго часу і трымціць асіна, калі ўзгадвае аб самазабойстве здрадніка Хрыстовага.
- Цікавы факт: асіна — дрэва з мяккай драўнінай, якая ў той жа час найменш за ўсе астатнія падпадае пад уплыў гніення. Працягласць жыцця гэтага дрэва — больш за 100 гадоў. З асіны вырабляюць самыя трывалыя старчакі для маставой.
- Калі пакласці асінавае палена ў мех з нягашанай вапнай, яна не будзе вільготнай і не «запарыцца»; калі пакласці кавалак асіны ў цэбар з квашанай капустай — яна не будзе брадзіць і не скісне.
- Прыкмячалі: калі на асіне вялікія пупышкі — да ўраджаю ячменю, асіна з «завушніцамі» — да ўраджаю аўса.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

---

## Усміхнемся

**Грамадзянін, памятай: праз два месяцы нечакана наступіць зіма!**

☺

Раніца, сям'я збіраецца снедаць. Дачка з маці на кухні, тата ў зале чытае. Маці:
— Спытай у таты, ці будзе ён снедаць.
Дачка бяжыць, перадае пытанне. Тата:
— Буду.
Дачка бяжыць назад, перадае адказ. Мама:
— Спытай у яго, што ён хоча на сняданак.
Дачка бяжыць да таты, перадае пытанне. Тата — юрыст:
— Папрасі маму абмаляваць гарызонты перспектыў у разрэзе наяўнага запасу прадуктаў.
Дачка прыбягае:
— Мама! Тата сказаў, што ён не будзе снедаць!

☺

**Калі дырэктар крамы здагадаўся прадаваць расол без агуркоў — продаж вырас у два разы.**

☺

Дыялогі ў сеціве.
Яна:
— Блін. Што рабіць, калі гузік на грудзях расшпільваецца ўвесь час?
Ён:
— Ганарыцца!




З днём нараджэння любімую дачушку, унучку і сястрычку **Алену ЛАПАТО**. Моцнага здароўя і плёну ў працы, божай апекі.
**Твая сям'я.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4791 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12